Аповед пра 25 асоб, нараджэнне, вучоба, служэнне ці смерць якіх навечна звязала з Мінскам. Яны б маглі ўвайсці ў гісторыю горада і Беларусі, як выпускнік першага выпуска юрфака БДУ; заснавальнік руху цвярозасці; бацька знакамітай балерыны, дзякуючы якой наш тэатр Оперы і балета мае тытул "Вялікі" і інш. А іх імены сыйшлі ў нябыт і доўгі час былі забароненыя для вымаўлення ўслых, пакуль у 1999 годзе не былі ўшанаваныя як імены праваслаўных святых новага часу...

# «СВЯТЫЯ. МІНСКА?»


Таццяна Хамянкова,

Аўтар экскурсіі «Мінск навамучанікаў»


Мінск, 2016



# *Свяшчэннамучанік Мітрафан Краснапольскі*

*1912 -1916 – епіскап Мінскі і Тураўскі*

*(1869- 1918)*



Па яго дабраславенні:

- Напісаны вобраз Мінскіх святых;
- Пастаўлена на належную вышыню ўшанаванне свяціцеляў Кірыла і Лаўрэнція Тураўскіх, святога немаўляткі Гаўрыіла;
- Штогадовыя хрэсныя ходы цвярозасці ў Мінску;
- Асвечаны спецыяльны вагон цвярозасці, на якім святары аб'язджалі Беларусь з прапаведзю супраць п'янства, распаўсюджвалі літаратуру;
- Шырокая дабрачынная дзейнасць па дапамозе мірным жыхарам, арганізацыя епархіяльных шпіталёў ва ўмовах ваеннага часу;

Асабіста:

Часта ездзіў на фронт, не аднойчы трапляў пад абстрэл. За дзейнасць ва ўмовах ваеннага часу ўзнагароджаны ордэнам Святога Дабравернага Князя Аляксандра Неўскага.

Расстраляны ў 1919 г. у Астрахані. Дабраславіў растрэльную каманду…

Помнік свмч. Мітрафану Краснанольскаму, першаму епіскапу Гомельскаму (1907 – 1912 гг.) ў Гомелі (часова на тэрыторыі Свята-Мікалаеўскага мужчынскага манастыра)



# Свяшчэннамучанік Іаан Рыжскі

*часова кіраваў Мінскай епархіяй з 1912 па 1913 г.*

*1876 – 1934*



Яго прыбыццё ў Мінску запомнілася святарам і вернікам урачыстымі Богаслужэннямі, якія ён здзяйсняў у:

- Кафедральным Свята-Петрапаўлаўскім саборы;
- Царкве Святога Духа (зараз кафедральны сабор);
- Прывакзальнай Свята-Казанскай царкве;
- Царкве ў гонар вобраза Маці Божай «Усіх тужлівых Радасць» пры турэмным замку

Глыбока ўшаноўваў святыні Мінскай епархіі:

- Цудотворныя вобразы Божай Маці «Мінская» і «Крупецкая».

Быў забіты на архіерэйскай прыгараднай дачы ў ноч з 11 на 12 кастрычніка 1934 г.

# Урачыстасці да дня памяці свяшчэннамучаніка Іанна Рыжскага ў Рызе



27.05.2006 года зацверджаны ордэн святога свяшчэннамучаніка Іаана , архіепіскапа Рыжскага



Цырымонія гашэння маркі з выявай свяшчэннамучаніка Іаана Рыжскага



# *Архіепіскап Мелхісэдэк Паеўскі*
## ***– першы мітрапаліт Беларускі***

***(1879–1931)***



- 1919 -1925 гг. служэнне ў часы моцных бальшавісцкіх рэпрэсій, канфіскацыі царкоўнай маёмасці;
- Служыў пры наяўнасці толькі 6 вернікаў у кафедральным саборы;
- Аднавіў хрэсныя ходы з вобразам Божай Маці «Крупецкая»;
- Падчас невялікай адлігі аднавіў выдавецтва «Мінскіх епархіяльных ведамасцяў», апублікаваў 2 невялікія духоўныя кнігі «Слова пра Уваход Господзень у Іерусалім» і «Божай літасцю»;
- **23 ліпеня 1922 г. акт абвяшчэння аўтаноміі Беларускай праваслаўнай царквы – паратунак ад расколу. Прымае цярновы вянец мітрапалічага служэння. Дзякуючы яго ўдалай царкоўнай палітыцы ў Мінскай епархіі аднаўленцтва не мела поспех і распаўсюд…**

Памер 17 мая 1931 г. ў Маскве падчас Літургіі ля Прастола Пакроўскай царквы па вул. Краснасельскай. Перазахаваны на Праабражэнскіх могілках.

# «Заўсёды малюся за царкву Беларускую…»

17. 05. 2011 асвечана дошка да 80-годдзя памяці праасвяшчэннага Мелхісэдэка (Паеўскага).
Штогод ля дошкі, якая месціцца на сценах інстытута тэалогіі БДУ адбываюцца паніхіды.



# Прападобнамучанік Серафім Жыровіцкі

(1901 – 1946)



1916 – 1917 – паслушнік Мінскага Свята-Духавага мужчынскага манастыра;

1941- 1942 – служэнне ў царкве былога Мінскага Свята-Прэабражэнскага жаночага манастыра;

1942 – удзел у адкрыцці Свята-Духавай царквы (зараз кафедральны сабор), служэнне у ім;

Айцец Серафім меў пастырскую апеку над лякарнямі горада, інвалíднымі дамамі і дзіцячымі прытулкамі, несучы ўсім слова суцяшэння;

1944 г. – мінская турма, пасля допытаў у якой сасланы ў лагер ў Горкоўскай вобласці, адкуль не вярнуўся…

# Царква ў гонар прападобнамучаніка Серафіма Жыровіцкага ў Слоніме і Гродна, штогадовы крыжовы ход 06 верасня

















Факультэт грамадзянскіх навук БДУ, 1 выпуск.

Студэнт юрфака Валер’ян Навіцкі



*«Диночка! Мне для сохранения жизни предложили отречься от Бога и от священнического сана. Я отказался. Как ты справишься одна с детками?»*

*«Валечка! Не отрекайся ни от Бога, ни от священнического сана. Мне поможет Господь».*

*Гэта былі апошнія словы, з якімі яны звярнуліся адзін да аднаго ў зямным жыцці. 23 лютага 1930 года а. Валер'яна расстралялі ў цімкавіцкім лесе…*

1911 – 1915, 1923, 1929 – настаяцель царквы у гонар вобраза Божай Маці « Усіх тужлівых Радасць»

Адначасова выкладчык закона Божага ў:

- Вучэльні для сляпых;
- Мужчынскай гімназіі па вул. Губернатарская (сучасная Леніна)
- Жаночай гімназіі па вул. Падгорная (сучасная Карла Маркса)

Служыў у Епархіяльнай Апецы бедных духоўнага звання;



Асаблівую ўвагу і клопат праяўляў да сляпых дзяцей

1915 – 1922 – клірык чыгуначнай Казанскай царквы

*а. Уладзімір Хіраска (1874 – 1933)*







Ушанаванне ў Мінску свмч. Уладзіміра Хіраска:

- Царква ў яго гонар па вул. Матусевіча 33;
- Моладзевае брацтва с сацыяльна-арыентаваным накірункам дзейнасці;
- Хоравыя вечары памяці свяшчэннамучаніка Уладзіміра Хіраска;



# Юлія Уладзіміраўна Хіраска:
## *2016  - 110 год са дня нараджэння*

1939 г. За балет «Салавей» медаль «За працоўную адзнаку», тэатр атрымлівае права называцца Дзяржаўным Вялікім тэатрам оперы і балета

Падчас вайны праца ў канцэртных брыгадах Паўночна-Заходняга і Калінінскага франтоў.
Медалі «За доблесную працу ў ВАВ 1941–1945 гг.» і «За перамогу над Германіяй у ВАВ 1941–1945 гг.»

Ніколі не хавала свайго паходжання.
У біяграфіі ад 15.04.1942 г. піша:
«Отец — служитель культа (умер в 1932 г.)».



# ВЫКЛАДЧЫКІ

## Мінскай Духоўнай семінарыі 1907 - 1918

а. Дзімітрый Паўскі



а. Уладзімір Зубковіч



а. Васіль Ізмайлаў


















# СТУДЭНТЫ

## Мінскай Духоўнай семінарыі з 1885 па 1918 г.

# *2016 год – 5-годдзе Сабора навамучанікаў і вызнаўцаў зямлі Беларускай:*

30.10 – ва ўсіх храмах БПЦ будзе служылася Літургія памяці навамучанікаў і вызнаўцаў зямлі Беларускай – прастольнае свята аднайменнай царквы ў Пакроўскім прыходзе ў Крупцах (м-н Вяснянка)

